газеты, неаднаразова друкаваліся артыкулы ў газеце "Наша слова".

Падагульняючы вопыт выкладчыкаў кафедры, думкі студэнтаў і меркаванні, якімі падзяліліся з намі супрацоўнікі музеяў, можна сцвярджаць, што вытворчая практыка — дзейсны сродак навучання і выхавання.

Дзеля большай яе эфектыўнасці плануецца працягваць выезды ў вядучыя музеі рэспублікі. Лічым неабходным вырашыць пытанне аплаты працы музейных работнікаў з нашымі студэнтамі. Гэта дасць магчымасць не абмяжоўвацца "бясплатнымі" базамі практыкі, а накіроўваць студэнтаў у рознапрофільныя музеі. Надзвычай актуальным таксама з'яўляецца закранутае вышэй пытанне спецыялізаванай (музейнай) камп'ютэрнай адукацыі студэнтаў.

**С.В.Гуткоўская,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ЗА ПЕДАГАГІЧНАЙ І ТВОРЧАЙ ПРАКТЫКАЙ СТУДЭНТАЎ: ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДЫХОД

Творчая і педагагічная практыка з'яўляецца спецыяльнай формай вучэбнага працэсу, які забяспечвае студэнтам кафедры харэаграфіі Беларускага універсітэта культуры магчымасць атрымання прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў непасрэдна ў харэаграфічных школах, студыях, ансамблях, клубах бальнага танца пры выкананні абавязкаў балетмайстра, рэпетытара, педагога, трэнера. Дасягненне мэт навучання немагчыма без пэўнай практычнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі для работы ў галіне харэаграфічнага мастацтва. Галоўная мэта вытворчай і педагагічнай практыкі — замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў у працэсе засваення імі прафесійнай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытворчая практыка студэнтаў-харэографаў — гэта перш за ўсё творчая дзейнасць, найважнейшая частка навучальнага працэсу ў ВНУ, якая завяршае вывучэнне шэрага спецыяльных дысцыплін. У ходзе педагагічнай практыкі замацоўваюцца і паглыбляюцца, прыводзяцца ў сістэму навыкі самастойнага падыходу да вырашэння педагагічных задач, удасканальваюцца ўменні, атрыманыя на тэарэтычных і практычных занятках.

Такім чынам, задача вышэйшай школы заключаецца ў падрыхтоўцы не простых выканаўцаў прафесійных функцый, а ўсебакова развітых спецыялістаў, здольных бачыць перспектывы развіцця грамадства і той галіны культуры і мастацтва, у якой яны будуць працаваць.

Пры арганізацыі працэсу праходжання практыкі студэнтаў асобая роля належыць кантролю за яе ходам, пад якім разумеецца сістэма праверкі вынікаў навучання. Кантроль педагагічнай і вытворчай практыкі — гэта сукупнасць шэрага дзеянняў, што дазваляюць выявіць якасныя і колькасныя характарыстыкі вынікаў навучання, ацаніць ступень засваення студэнтамі матэрыялу вучэбнай праграмы і вызначыць іх здольнасць выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці.

Асаблівая ўвага на кафедры харэаграфіі надаецца ўдасканаленню працэсу арганізацыі і пашырэння формаў кантролю за ходам педагагічнай і вытворчай практыкі студэнтаў IV і V курсаў.

Па-першае, на кафедры існуе сістэма кантрольных мерапрыемстваў, якая здзяйсняецца на планавай аснове. Рэгулярны кантроль на базах практыкі студэнтаў праводзяць выкладчыкі — кіраўнікі акадэмічных груп. Колькасць гадзін пазначана ў іх індывідуальных планах і фіксуецца ў журнале ўліку выканання педагагічных даручэнняў па фактычных затратах часу. Менавіта кіраўнікі практыкі ВНУ даюць аб'ектыўны аналіз практыкі па яе заканчэнні, а таксама клапоцяцца аб ліквідацыі выяўленых недахопаў. У час прыёму справаздач яны ацэньваюць фактычны канчатковы вынік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыкі кожнага студэнта. Другой разнавіднасцю кантролю з боку кафедры з'яўляецца наведванне баз практыкі загадчыкам кафедры ў рамках плана ўзаеманаведвання занят-каў. Адказны за практыку выкладчык на кафедры кантралюе своечасовасць прад'яўлення справаздач студэнтамі, аналізуе іх якасць, робіць агульную справаздачу аб выніках педагагічнай і вытворчай практыкі, а таксама сочыць за станам і падрыхтоўкай на кафедры неабходнай дакументацыі па практыцы.

Па-другое, кантрольныя праверкі работы студэнтаў на практыцы праводзяцца па адзінай метадычнай аснове, якая забяспечвае супараўнальнасць атрыманай інфармацыі.

Па-трэцяе, кантрольныя мерапрыемствы накіраваны не толькі на выяўленне недахопаў, а галоўным чынам на паказванне аптымальных шляхоў іх устаранення. Прытрымліванне гэтых патрабаванняў забяспечвае эфектыўнасць кантролю (папярэдні, бягучы, рубежны і выніковы), кожны з якіх вырашае пэўную задачу. Да самых распаўсюджаных формаў адносяцца наступныя: папярэдні інструктаж студэнтаў ва універсітэце; рэйды ў першы дзень практыкі з мэтай выяўлення своечасовага прыбыцця практыкантаў на базы практыкі; наведванне заняткаў, урокаў, рэпетыцый і канкрэтных выступленняў, якія праводзяцца студэнтамі; размова з кіраўніком базы практыкі і кіраўніцтвам установы, дзе яна праходзіць; праверка пісьмовай дакументацыі, якую вядзе практыкант згодна з зацверджанай праграмай практыкі і індывідуальным заданнем; калёквіумы; выніковы залік.

Наведванні ўрокаў, рэпетыцый, заняткаў па ступені папярэдняй інфармаванасці практыкантаў бываюць узгодненыя, калі студэнт загадзя азнаёмлены з праграмай і часам правядзення праверкі, і аператыўныя (раптоўныя), калі без папярэджвання выкладчыкам фіксуецца фактычны стан прысутнасці практыканта на месцы. Гэта прымушае студэнтаў працаваць сістэматычна і планамерна.

У асобных выпадках можа быць выкарыстана анкетнае апытанне студэнтаў для вызначэння іх ведаў па асноўных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палажэннях рабочай праграмы практыкі і меркавання па галоўных аспектах яе арганізацыі. Адразу пасля абароны практыкантамі вынікаў практыкі можна правесці франтальнае апытанне студэнтаў акадэмічнай групы ў мэтах выяўлення ўзроўню фактычных ведаў па прадугледжаных рабочай праграмай пытаннях педагагічнай і творчай практыкі.

Трэба падкрэсліць, што галоўным з'яўляецца тое, што выкладчык, выкарыстоўваючы тую або іншую форму кантролю, дыферэнцыравана падыходзіць да праверкі работы кожнага студэнта, улічвае яго асобасныя якасці.

Паколькі ў працэсе як педагагічнай, так і творчай практыкі ўдзельнічае некалькі бакоў (студэнт, выкладчык і кіраўнік ад базы практыкі), практычнае навучанне мэтазгодна разглядаць як працэс узаемадзеяння ўсіх трох бакоў. Разнастайная па формах і зместу сумесная дзейнасць студэнта і кіраўніка ад базы павінна быць накіравана не толькі на засваенне ведаў і набыццё ўменняў, але і на пабудову сістэмы адносін паміж імі, формаў супрацоўніцтва, якія дазваляюць актывізаваць працэс практычнага навучання і, самае галоўнае, развіваць асобасныя якасці кожнага студэнта.

Адной з найбольш эфектыўных формаў у гэтым сэнсе з'яўляецца калёквіум. Ён павінен стымуляваць і рацыяналізаваць працу студэнтаў, вучыць уменню бачыць практычныя магчымасці скарыстання атрыманых ведаў. Падчас калёквіуму вызначаецца, у якой ступені студэнты валодаюць мовай, спецыяльнай тэрміналогіяй і апаратам адпаведнай галіны ведаў. Адвольная размова дазваляе выкладчыку лепш вывучыць інтарэсы і схільнасці студэнта, ацаніць яго сапраўдную падрыхтоўку да самастойнай прафесійнай дзейнасці.

Па жаданні студэнтаў або ініцыятыве выкладчыка праводзяцца індывідуальныя кансультацыі па пытаннях практыкі. Мэтазгодна ўстанаўліваць на кафедры падчас практыкі пэўныя дні для кансультацый.

Такім чынам, формы кантролю практыкі студэнтаў залежаць ад мэты, задачы і віду кантролю. Яны павінны быць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнымі, разнастайнымі і абавязкова прадугледжваць дыферэнцыраваны падыход з боку выкладчыкаў і кіраўнікоў баз практыкі пры іх здзяйсненні.

Асобую актуальнасць сёння набывае пастаяннае ўдасканаленне формаў кантролю за педагагічнай і творчай практыкай у залежнасці ад патрабаванняў часу.

**І.А.Дарохіна,**
**дырэктар дзіцячай харэаграфічнай школы г.Мінска**

## ПОШУК ШЛЯХОЎ ВЫКАНАННЯ СУМЕСНЫХ ТВОРЧЫХ ПРАЕКТАЎ ВУЧНЯЎ І СТУДЭНТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вырашаць задачы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў для Рэспублікі Беларусь можна з дапамогай творчага кантакту Беларускага універсітэта культуры і адзінай у г.Мінску дзіцячай харэаграфічнай школы.

Кантакт гэты трэба будаваць па законе творчасці, каштоўнасць яго бачыцца не ў выніку, не ў прадукце творчасці, а ў самім працэсе.

Асаблівасць дзейнасці дзіцячай харэаграфічнай школы (ДХШ) як базы практыкі ў наступным.

Па-першае, усе навучэнцы ДХШ з'яўляюцца вучнямі спецыяльна арганізаваных класаў базавых школ № 12, 83, 155, 209. Яны фарміруюцца выкладчыкамі харэаграфічнай школы шляхам праверкі здольнасцей, фізічных магчымасцей і творчага патэнцыялу дзяцей. Расклад заняткаў у іх складаецца з улікам занятасці у дзвюх школах, нават з вызваленнем ад дубліруючых прадметаў. Арганізаваны спецрэйсы прывозу вучняў на заняткі згодна раскладу школы, што дазваляе практыканту не звяртаць увагі на арганізацыйныя пытанні.

Па-другое, выкладчыкі, якія навучаюць харэаграфіі, фарміруюць асобу, развіваюць яе фізічна, эмацыянальна, музыкальна, інтэлектуальна. Усе набываемыя прафесійныя навыкі ў харэаграфіі і музыцы, усе свае магчымасці і